Государственное учреждение
«Национальное агентство по туризму»

# ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ ТУРИЗМА В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ: МИРОВЫЕ ТЕНДЕНЦИИ И РЕГИОНАЛЬНЫЕ КОНТЕКСТЫ

МАТЕРИАЛЫ IV МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

Минск, 27 сентября 2024 г.

Минск
«Колорград»
2024

УДК [379.83/.84+796.5](082)
ББК 75.81я43
П27

Редакционная коллегия:
директор Департамента по туризму Министерства спорта и туризма
Республики Беларусь, кандидат культурологии, доцент
*Ирина Николаевна Воронович* (председатель);
академик-секретарь Отделения гуманитарных наук и искусств
Национальной академии наук Беларуси, доктор исторических наук,
профессор *Александр Александрович Коваленя*;
директор Института истории Национальной академии наук Беларуси,
кандидат исторических наук, доцент *Вадим Леонидович Лакиза*;
проректор по научной работе учреждения образования
«Белорусский государственный университет культуры и искусств»,
кандидат искусствоведения, доцент *Елена Евгеньевна Корсакова*;
ректор учреждения образования «Белорусский государственный университет
физической культуры», доктор экономических наук, доцент *Сергей Борисович Репкин*;
заведующий кафедрой международного туризма Белорусского государственного
университета, доктор исторических наук *Леонид Михайлович Гайдукевич*;
директор государственного учреждения «Национальное агентство по туризму»,
кандидат исторических наук *Дмитрий Викторович Морозов*;
заместитель директора государственного учреждения
«Национальное агентство по туризму» *Анна Николаевна Вощинчук*

П27 **Перспективы** развития туризма в современных условиях: мировые тенденции и региональные контексты : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 27 сент. 2024 г. / Национальное агентство по туризму ; редкол.: И. Н. Воронович (предс.) [и др.]. – Минск : Колорград, 2024. – 539 с.
ISBN 978-985-896-855-7.

В сборнике представлены материалы докладов участников конференции по вопросам развития международного и трансграничного туризма, внутреннего и въездного туризма в современных условиях, нормативно-правового регулирования туристической деятельности, использования потенциала историко-культурного наследия в туризме, подготовки кадров в сфере туризма, развития видов туризма и практик экскурсионной работы.

Материалы предназначены для представителей туристической сферы, преподавателей туристических дисциплин, аспирантов, магистрантов, студентов учреждений высшего образования, экскурсоводов, гидов-переводчиков и всех, кто интересуется вопросами развития туризма.

**УДК [379.83/.84+796.5](082)**
**ББК 75.81я43**

**ISBN 978-985-896-855-7**

© ГУ «Национальное агентство по туризму», 2024
© Оформление. ООО «Колорград», 2024

**Д. А. Арешонок, Е. М. Янкевич**
ПРИМЕНЕНИЕ ИНФОРМАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В УПРАВЛЕНИИ СФЕРОЙ ТУРИЗМА ........ 341

**А. Э. Власюк, Н. М. Борисенко**
ТЕХНОЛОГИЧЕСКОЕ РАЗВИТИЕ ИНДУСТРИИ ГОСТЕПРИИМСТВА: СОВРЕМЕННЫЙ АСПЕКТ ........ 347

**Е. М. Еловая**
КОНЦЕПЦИЯ ТУРИСТИЧЕСКОГО БРЕНДА ПОСТАВСКОГО РАЙОНА ........ 358

**О. Ф. Каган**
ВОЗМОЖНОСТИ ПРИМЕНЕНИЯ ИСКУССТВЕННОГО ИНТЕЛЛЕКТА В ТУРИЗМЕ ........ 371

**Н. Н. Морозова**
ЦИФРОВЫЕ ТРАНСФОРМАЦИИ В ТУРИСТСКОЙ ИНДУСТРИИ И ИХ ВЛИЯНИЕ НА ЗАНЯТОСТЬ В ДАННОЙ СФЕРЕ ........ 380

**М. В. Пуренок**
СПЕЦИФИКА ПОЗИЦИОНИРОВАНИЯ САНАТОРНО-КУРОРТНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ С ИСПОЛЬЗОВАНИЕМ СОБСТВЕННОГО ИНТЕРНЕТ-САЙТА ........ 391

**М. М. Слесарава, А. А. Бакуновіч, М. А. Хацькова, Д. І. Латышэвіч, Н. В. Анофранка, Ю. С. Гецэвіч**
УПЛЫЎ АЎДЫЯГІДАЎ НА ЎЗБАГАЧЭННЕ МУЗЕЙНАГА ДОСВЕДУ ........ 401

**А. Р. Тимофеева**
ЦИФРОВИЗАЦИЯ «ЗЕЛЕНОЙ» ЭКОНОМИКИ БЕЛАРУСИ: ESG-ФИНАНСИРОВАНИЕ ДЛЯ УСТОЙЧИВОГО ТУРИЗМА ........ 409

**С. В. Чувак**
ИНТЕГРАЦИОННЫЕ ПРОЦЕССЫ СТРАН СНГ И РАЗВИТИЕ ВЪЕЗДНОГО ТУРИСТИЧЕСКОГО РЫНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ (2019–2023) ........ 421

8. Пуренок, М. В. Перспективы продуктовой и географической диверсификации медицинского и лечебно-оздоровительного туризма в Беларуси / М. В. Пуренок // Перспективы развития туризма в современных условиях: мировые тенденции и региональные контексты : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 28 сент. 2023 г. / Национальное агентство по туризму ; редкол.: И. Н. Воронович (предс.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 253–263.

УДК [004.934+681.84.081]-028.17:069.122(476)

# УПЛЫЎ АЎДЫЯГІДАЎ НА ЎЗБАГАЧЭННЕ МУЗЕЙНАГА ДОСВЕДУ

**М. М. Слесарава, А. А. Бакуновіч, М. А. Хацькова, Д. І. Латышэвіч, Н. В. Анофранка, Ю. С. Гецэвіч**
Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі,
вул. Сурганава 6, 220012,
г. Мінск, Беларусь,
ssrlab221@gmail.com

**Анатацыя.** У дадзеным артыкуле разглядаецца важнасць аўдыягідаў у кантэксце вядзення музейнай справы, іх уплыў на ўзровень уцягнутасці наведвальнікаў і спосабы выкарыстання для павышэння гісторыка-культурнай каштоўнасці музейных экспазіцый. На прыкладзе двух аўдыягідаў для музеяў «Бярэсце» і «Лідскі замак» абгрунтавана значнасць прыведзеных прыстасаванняў як сродкаў паляпшэння музейнага вопыту і ўзбагачэння ведаў наведвальнікаў.

**Ключавыя словы:** аўдыягід, турызм, музей, славутасць, культурна-гістарычная спадчына, экспазіцыя.

**Узор цытавання:** Уплыў аўдыягідаў на ўзбагачэнне музейнага досведу / М. М. Слесарава [і інш.] // Перспектывы развіцця турызму ў сучасных умовах: сусветныя тэндэнцыі і рэгіянальныя кантэксты : матэрыялы IV Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 вер. 2024 г. / Нацыянальнае агенцтва па турызме ; рэдкал.: І. Н. Варановіч (старш.) [і інш.]. – Минск, 2024. – С. 401–408.

# THE IMPACT OF AUDIO GUIDES ON ENRICHING THE MUSEUM EXPERIENCE

**M. Slesarava, A. Bakunovich, M. Chackova, D. Latyshevich, N. Anofranka, Ju. Hetsevish**
United Institute of Informatics Problems of the National Academy of Sciences of Belarus,
Surganova St., 6, 220012,
Minsk, Belarus,
ssrlab221@gmail.com

**Annotation.** This article describes the importance of audio guides in the context of museology, their impact on the level of visitor engagement and ways to use them to enhance the historical and cultural value of museum exhibitions. The importance of these devices as a means of improving the museum experience and enriching the knowledge of visitors is substantiated using the example of two audio guides for Berestse Archaeological Museum and Lida Castle.

**Keywords:** an audio guide, tourism, a museum, landscape, cultural and historical heritage, exposition.

**For citation:** The impact of audio guides on enriching the museum experience / M. Slesarava [et al.] // Prospects for the development of tourism in modern conditions: global trends and regional contexts : materials of the IV Int. sci.-pract. conf., Minsk, 27 Sept. 2024 / National Agency for Tourism ; ed.: I. Voronovich (chair.) [et al.]. – Minsk, 2024. – P. 401–408.

Музеі маюць доўгую гісторыю, пачынаючы са старажытных часоў, як месцы захоўвання і вывучэння калекцый, да сёняшніх мультыфункцыянальных устаноў, якія прапануюць разнастайныя праграмы для грамадства. Музеі адыгрываюць важную ролю ў захаванні і перадачы ведаў, каштоўнасцяў і ўнікальных гісторый, спрыяючы фарміраванню і развіццю культурнай свядомасці і адукацыі грамадства.

Музейная справа ўяўляе сабой комплекс дзейнасці, звязаны з арганізацыяй і кіраваннем музейнымі ўстановамі, а таксама іх развіццём, што садзейнічае вывучэнню гісторыі. Асноўная мэта музейнай справы – захаванне і папулярызацыя культурнай і гістарычнай спадчыны праз экспазіцыі, выставы, адукацыйныя праграмы,

даследаванні і іншыя віды дзейнасці; стварэнне даступнага і разнастайнага асяроддзя для навучання, натхнення і адукацыі. Музеі працягваюць развівацца, адаптуючыся да зменлівых патрэб наведвальнікаў і выкарыстоўваючы разнастайныя падыходы для дасягнення прыведзеных мэт.

У час лічбавых тэхналогій музеі сутыкаюцца з неабходнасцю не толькі захоўваць і выстаўляць экспанаты, дэманстраваць славутасці розных мясцін, але і прадастаўляць наведвальнікам больш інтэрактыўны і даступны вопыт. У гэтым ім дапамагаюць аўдыягіды. Аўдыягід – гэта інавацыйны спосаб прадастаўлення інфармацыі пра месцы, гісторыю або прадметы з дапамогай тэкставых паведамленняў і аўдыязапісаў. Ён дазваляе карыстальнікам атрымаць падрабязную інфармацыю і адчуць атмасферу незалежна ад часу і месца. Працэс распрацоўкі падобных дадаткаў мае сваю спецыфіку, што ўказвае на неабходнасць уліку такіх фактараў, як выбар тэматыкі і мэтавай аўдыторыі; складанне правільнага сцэнарыя і тэкставых апісанняў, што з'яўляецца ключавым фактарам поспеху аўдыягіда; выбар голасу і якасны запіс аўдыяматэрыялу, што ўплывае на ўспрыманне аўдыягіда; тэхнічныя аспекты, такія як выбар фармату і платформы, гукавых эфектаў і праца з аўдыяабсталяваннем.

У гэтым артыкуле мы разгледзім, што такое аўдыягіды на прыкладзе музея «Бярэсце» і Лідскага замка, як ажыццяўляецца іх распрацоўка і якія тэхнічныя аспекты варта ўлічваць. Дадзеныя прыкладанні падрыхтаваны супрацоўнікамі лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі [1] пры падтрымцы спецыялістаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Стварэнне аўдыягідаў для музеяў накіравана на прадстаўленне большага доступу да экспазіцый і экспанатаў. Сістэма аўдыягіда будзе карысная як наведвальнікам на экскурсіях у музеях, так і тым, хто не можа ці не жадае прысутнічаць у стацыянарных музеях, але цікавіцца зместам таго ці іншага музея. Карыстальнік можа вывучаць экспанаты і праслухваць інфармацыю пра іх, не пакідаючы дома або працоўнага месца.

Для рэалізацыі аўдыягідаў археалагічнага музея «Бярэсце» і Лідскага замка былі пастаўлены наступныя мэты:

− распрацоўка, тэхнічная падтрымка, суправаджэнне і тэсціраванне праграмнага забеспячэння аўдыягіда;

− збор, апрацоўка тэкставых матэрыялаў, іх агучванне;

− канструяванне веб-версіі аўдыягіда на розных мовах;

– дабаўленне кантэнту і распрацоўка аўдыягіда для iOS- і Android платформ.

Кантэнтная частка праектаў уключае ў сябе падрыхтоўку тэксту, малюнкаў і культурных аб’ектаў ці экспанатаў кампаніямі-пастаўшчыкамі кантэнту. Першапачатковы тэкст ствараецца на рускай мове, правяраецца на арыгінальнасць і гістарычную праўдзівасць, а затым перакладаецца на розныя замежныя мовы з захаваннем асаблівасцяў беларускай транслітарацыі. Наступным крокам выступае агучванне тэкставых паведамленняў дыктарамі і сістэмамі сінтэзу маўлення па тэксце. Распрацоўка тэхнічнай частцы ажыццяўляецца ў рамках абраных платформаў, менавіта Web, Android і iOS. Немалаважнай часткай з’яўляецца тэсціраванне функцыянальнасці аўдыягідаў як тэсціроўшчыкамі, так і простымі карыстальнікамі (гідамі, гісторыкамі, філолагамі і інш.).

*Археалагічны музей «Бярэсце»* з’яўляецца ўнікальным месцам, дзе можна ўбачыць археалагічныя знаходкі, што адносяцца да сярэднявечнага ўсходнеславянскага горада [2]. Гэта адзіны ў свеце музей, размешчаны на месцы дзяцінца старажытнага Бярэсця, што робіць яго адзіным такім музеем у Еўропе. Ён з’яўляецца часткай Брэсцкага абласнога музея і карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод жыхароў і турыстаў горада.

З выкарыстаннем аўдыягіда [3] музей прапануе магчымасць даследаваць і вывучаць яго экспанаты праз зручны і просты інтэрфейс прыкладання (малюнак 1). Змест аўдыягіда адаптаваны на беларускай, англійскай, рускай, польскай і кітайскай мовах, тэкставыя апісанні агучаны прафесійнымі дыктарамі і дададзены ў адміністрацыйную панэль для доступу наведвальнікам.

У цяперашні час аўдыягід прадстаўляе 67 экспанатаў, размешчаных у 13 залах музея, уключаючы галоўны экспанат – археалагічны раскоп плошчай 1 118 м$^3$. Кожны прадмет экспазіцыі забяспечаны кароткім апісаннем, фота і аўдыязапісам на пяці мовах. У кожнай зале музея размешчаны QR-код для дакладнага пазіцыянавання па аб’ектах з дапамогай аўдыягіда, што дазваляе наведвальнікам аўдыявізуальна азнаёміцца з экспанатамі асобнай залы [4].

Аўдыягід прадстаўлены ў выглядзе IT-платформы, якая ўключае мабільныя дадаткі як для Android, так і для iOS і веб-сайт, створаны на мове праграмавання Python з выкарыстаннем базы даных MySQL. Сістэма праходзіць бесперапыннае тэсціраванне на адпаведнасць

спецыфікацыі. Загрузка даных для мабільнага дадатку, такіх як малюнкі і аўдыязапісы, а таксама праверка наяўнасці абнаўленняў, ажыццяўляецца не толькі праз стандартныя бібліятэкі Java для Android, але і з дапамогай іншых бібліятэк, уключаючы Apache і Picasso. Электронны гід даступны для спампавання ў Google Play або App Store, а таксама на стацыянарным камп'ютары праз Інтэрнэт. Гэта дазваляе бясплатна праводзіць віртуальныя экскурсіі для тысяч карыстальнікаў, а арганізатарам – адсочваць папулярныя экспанаты або дадаваць/абнаўляць новыя.




**Малюнак 1. Android-версія аўдыягіда па археалагічным музеі «Бярэсце»**

*Аўдыягід па Лідскаму замку* з'яўляецца каштоўным інструментам для азнаямлення з аб'ектамі адзінага на тэрыторыі Беларусі дзеючага замка-кастэля [5]. Лідскі замак – гэта гістарычная крэпасць, пабудаваная ў XIV ст. [6]. Ён уяўле сабой выдатны прыклад сярэднявечнай архітэктуры і адыгрываў важную ролю ў гісторыі рэгіёну. У нашыя дні ён з'яўляецца папулярнай турыстычнай славутасцю. Праведзеныя работы па рэстаўрацыі спрыяюць прыцягненню наведвальнікаў, якія жадаюць даведацца пра гісторыю, архітэктуру і значэнне крэпасці для рэгіёна. Замак таксама служыць месцам для розных культурных мерапрыемстваў, выстаў і фестываляў, што робіць яго важным цэнтрам для жыхароў Ліды і турыстаў. Экскурсия па замку дае магчымасць не

толькі ўбачыць і ацаніць яго архітэктурныя элементы, але і пагрузіцца ў атмасферу сярэднявечнай Беларусі.

Распрацаваны аўдыягід пагрузіць наведвальніка ў гістарычную атмасферу Лідскага замка, прадэманструе экспазіцыі вонкавага агляду, веж Гедыміна і Вітаўта (малюнак 2). Кожная экспазіцыя прадстаўляе выяву экспаната ці часткі замка, кароткае тэкставае апісанне і агучаны аўдыяфайл на беларускай мове. Праграма даступна ў вэб- і iOS-версіях, якія знаходзяцца ў адкрытым доступе. Вэб-версія распрацавана на мове праграмавання Python з выкарыстаннем Framework Django і базы даных MySQL. Для загрузкі даных, такіх як малюнкі і аўдыяфайлы, а таксама для праверкі абнаўленняў мабільнага дадатку выкарыстоўваюцца бібліятэкі Alamofire і SDWebImage для iOS.




**Малюнак 2. Мабільная iOS-версія аўдыягіда Лідскі замак**

Работы па інфармацыйна-праграмнай падтрымцы функцыянавання аўдыягіда ўключаюць:

– распрацоўку аўдыягіда для сучаснага інтэрнэт-браўзера (Chrome, Explorer, Firefox, Safari);

– распрацоўку мабільнага дадатку аўдыягіда на базе платформы iOS;

– кансультаванне супрацоўнікаў Дзяржаўнай установы «Лідскі гісторыка-мастацкі музей» па правілах работы з прыкладным праграмным забеспячэннем аўдыягіда;

– аднаўленне працаздольнасці пасля аварыйных сітуацый;
– тэсціраванне праграмнага забеспячэння аўдыягіда.

На дадзены момант аўдыягід даступны толькі на беларускай мове, колькасць моў у бліжэйшы час будзе павялічана. У ім прадстаўлены 10 зон і 3 экспазіцыі. Агулам яны апісваюць 51 экспанат. Як і ў папярэднім аўдыягідзе, кожны экспанат змяшчае кароткае тэкставае апісанне, малюнак і аўдыязапіс на беларускай мове.

Абодва аўдыягіды змешчаны ў адкрытым доступе на інтэрактыўнай платформе Krokam [7], якая прапануе карыстальнікам мноства турыстычных сродкаў, уключаючы аўдыягід па міжнароднай выставе «Беларусь і Біблія», аўдыягід па музеі НАН Беларусі, аўдыягід «DRUK VKL» па друкарнях ВКЛ на тэрыторыі Беларусі, аўдыягід па XXVI Міжнароднаму форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях ТІБО-2019 (TIBO), аўдыягід Krokapp па ўсёй Беларусі. Прадстаўленыя аўдыягіды дапамагаюць карыстальнікам знаёміцца з рознымі культурнымі месцамі, гістарычнымі падзеямі, музейнымі выставамі і экспанатамі, што дае магчымасць выбраць найбольш прыдатнае прыкладанне ў залежнасці ад інтарэсаў. Важнай асаблівасцю кожнага аўдыягіда з’яўляецца наяўнасць дзвюх версій для розных платформаў: вэб-версіі і Android і/ці iOS [8]. Каб выбраць патрэбную версію, дастаткова клікнуць на спасылцы на сайце, і сістэма аўтаматычна перанакіруе на адпаведную версію.

Такім чынам, аўдыягіды па археалагічным музеі «Бярэсце» і Лідскім замку ўяўляюць сабой якасны інструмент знаёмства з экспанатамі і экспазіцыямі двух унікальных гісторыка-культурных помнікаў, якія маюць значную каштоўнасць для краіны. Аўдыягіды дазваляюць пазнаёміцца з экспазіцыйнымі аб’ектамі падчас экскурсіі і дыстанцыйна. Наяўнасць вэб- і мабільных версій дае магчымасць выбару найбольш зручнага спосабу знаёмства з прыведзенымі месцамі, не звяртаючыся да экскурсаводаў і гідаў, у тым фармаце, якому наведвальнікі аддаюць перавагу.

Трэба адзначыць, што аўдыягіды ператвараюцца ў неад’емную частку музейнага вопыту, пашыраючы даступнасць і павышаючы ўзровень інтэрактыўнасці. Іх магчымасці дазваляюць музеям ствараць больш багаты, цікавы і запамінальны вопыт для наведвальнікаў. Далейшае развіццё інавацыйных тэхналогій і крэатыўнага кантэнту будзе стымуляваць рост папулярнасці аўдыягідаў у сучасных музеях.

## Спіс літаратуры

1. Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення [Электронны рэсурс]. – 2020. – Рэжым доступу: https://ssrlab.by/. – Дата доступу: 18.02.2020.

2. Археологический музей «Берестье» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// berestje.brest.museum.by. – Дата доступа: 26.05.2020.

3. Аўдыягід па археалагічным музеі "Бярэсце" // [Электронны рэсурс]. – 2020. – Рэжым доступу : https://krokam.com/biarescie. – Дата доступу: 10.03.2020.

4. Аўдыягід для археалагічнага музея горада Брэста "Бярэсце" (Беларусь) / Э. У. Русецкая [і інш.] // Молодежь в науке – 2020 : тез. докл. XVII Междунар. науч. конф. «Молодежь в науке» (Минск, 22–25 сентября 2020 г.) / редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2020. – С. 403–406.

5. Аўдыягід "Лідскі замак" [Электронны рэсурс]. – 2023. – Рэжым доступу: https://lida-zamak.krokam.by/. – Дата доступу: 20.05.2023.

6. Дзяржаўная ўстанова «Лідскі гісторыка-мастацкі музей» // [Электронны рэсурс]. – 2023. – Рэжым доступу: https://lixmuseum.by/be/glavnaya/. – Дата доступу: 21.01.2023.

7. KROKAM па тутэйшым краі і ваколіцах з вашым асабістым аўдыягідам [Электронны рэсурс]. – 2021. – Рэжым доступу: https://krokam.com/#. – Дата доступу: 01.03.2020.

8. Аўдыягіды Krokam у індустрыі беларускага турызму / М. М. Слесарава [і інш.] // Перспективы развития туризма в современных условиях: мировые тенденции и региональные контексты / Национальное агентство по туризму ; редкол.: И. Н. Воронович (предс.) и др. – Минск : Колорград, 2023. – С. 454–463.